МГПУ им. И.П.Шамякина

**ВЫКАРЫСТАННЕ ЗАГАДАК НА ЎРОКУ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ**

***Бярдзічавец Д. М.*** *(УА МДПУ імя І. П. Шамякіна, Мазыр)*
***Навуковы кіраўнік*** *– А. В. Солахаў, канд. філал. навук, дацэнт*

Загадка – метафарычны выраз, у якім адзін прадмет адлюстроўваецца праз другі, што мае з ім якое-небудзь, хоць бы аддаленае, падабенства. Праца з загадкамі ў пачатковых класах накіравана на развіццё ў вучняў уменняў адгадваць загадкі. Загадкі садзейнічаюць актывізацыі і інтэлектуальнай дзейнасці дзяцей, выпрацоўцы ў іх назіральнасці і знаходлівасці [1, 29].

Адным з важнейшых відаў працы па развіцці маўлення вучняў на ўроку з'яўляецца слоўнікавая праца. Папаўненне слоўнікавага запасу адбываецца на працягу ўсяго жыцця чалавека,

але неабходнасць узбагачэння слоўніка асабліва востра адчуваецца ў пачатковых класах. Настаўнікам пачатковых класаў дапамагаюць ў гэтым загадкі [2, 78].

Вось, напрыклад, як можна правесці слоўнікавую працу з назоўнікам *рабіна*:

1) адгадванне загадкі (*Паверх лесу агонь гарыць*);

2) разглядванне муляжа рабіны;

3) увядзенне слова ў сказ (*У лесе ўжо паспела рабіна*);

4) падбор словазлучэнняў (*цудоўная рабіна, рабінавае варэнне, рабінавы кампот*);

5) характарыстыка слова *рабіна* па яго прыкметах (*рабіна* (якая?) *румяная, салодкая, кіслая, зялёная, спелая* і г. д.).

На ўроках беларускай мовы можна выкарыстоўваць загадкі для правядзення слоўнікавага дыктанта.

Напрыклад, вучням 4 класа ў першым паўгоддзі настаўнік прапаноўвае наступныя загадкі: Што без вады плавае? (*Воблака.*) Без крылаў, а ляціць, без языка, а гаворыць. (*Пісьмо.*) Бягу асфальтам і заўжды трымаюся за правады. (*Тралейбус.*) Чым я больш вярчуся, тым я больш таўсцею. (*Верацяно.*) Ляжыць калода сярод балота, не гніе і не сохне. (*Язык.*)

Загадкі можна выкарыстоўваць пры вывучэнні розных часцін мовы. Вучням настаўнік прапаноўвае загадку, адгадка якой з'яўляецца той часцінай мовы, якую вучні пачнуць вывучаць на ўроку. Напрыклад, у трэцім класе ў пачатку вывучэння тэмы “Назоўнік” даецца загадка: *Ляжыць пад ганкам – хвост абаранкам* (*сабака*). Неабходна вызначыць лексічнае значэнне слова-адгадкі, паставіць да яго пытанне, вызначыцца з назвай часціны мовы.

Важнае месца на ўроках беларускай мовы займае творчая праца з загадкамі. Так, на ўроку з рассыпаных слоў загадкі можна прапанаваць сабраць і адгадаць яе. Напрыклад: *без, гаворыць, языка, а* (*Без языка, а гаворыць*).

Гульня “Аднаві загадку” таксама накіравана на развіццё памяці вучняў, іх творчых здольнасцей. Настаўнік прапануе вучням аднавіць наступныя загадкі:

1) *..., а ў клубок не зматаеш.* (*Нітак многа, а ў клубок не зматаеш. — Павуціна.)*

2) *...., а дрэвы лечыць.* (*Не доктар, а дрэвы лечыць. — Дзяцел.*)

Адзін з найбольш карысных прыёмаў выкарыстання загадак на ўроку – прыдумванне загадак самімі вучнямі. Вучням 3-га класа, напрыклад, прапануем скласці загадку пра паветраны шар. Для гэтага выкарыстаем табліцу.

Табліца – Падбор слоўнага матэрыялу для загадкі

| **Крытэрыі для падабенства** | **Прымета** | | **На што падобны** |
|---|---|---|---|
| Форма | круглы, авальны | | сонца, кавун, гарбуз, яйцо |
| Колер | чырвоны, жоўты, зялёны, блакітны, сіні, рознакаляровы | | хусцінка, сукенка вясёлка, |
| Вага | лёгкі | | матылёк, пушынка, лісток |

У пустую графу дзеці могуць уставіць злучнікі *як, нібы, быццам* або злучнік *ды* з адмоўнай часціцай *не*. Атрымаецца: *Круглы, як сонца, бывае, нібы хусцінка, і чырвоным, і жоўтым, і зялёным, і блакітным, і сінім, лёгкі, быццам матылёк*. Або: *Круглы, ды не сонца, бывае і чырвоным, і жоўтым, і зялёным, і блакітным, і сінім, ды не хусцінка, лёгкі, ды не матылёк*.

Такім чынам, сістэматычная праца на кожным уроку па выкарыстанні загадак, уважлівы падыход да кожнага слова, да кожнай творчай працы вучняў спрыяе развіццю актыўнай маўленчай дзейнасці вучняў, павышэнню іх агульнай моўнай культуры. Загадкі можна выкарыстоўваць на розных этапах урока: у час маўленчай размінкі, абвяшчэння тэмы ўрока, пры абагульненні, замацаванні і паўтарэнні.

Літаратура

1. Паўлоўская, В. І. Мова : цікава і займальна / В. І. Паўлоўская. – Мінск : Народная асвета, 1989. – 320 с.

2. Чухрова, Л. В. Работа над словам / Л. В.Чухрова. – Мінск : Завігар, 1998. – 248 с.

МГПУ им. И.П.Шамякина